ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
28.08.2025 №155

# Праграма карэкцыйных заняткаў «Сацыяльна-бытавая арыенціроўка» для I–IV класаў вучэбнага плана спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату з беларускай мовай навучання и выхавання

## ГЛАВА 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная праграма карэкцыйных заняткаў «Сацыяльна-бытавая арыенціроўка» (далей – праграма) прызначана для I–IV класаў устаноў спецыяльнай адукацыі для вучняў з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату з беларускай мовай навучання и выхавання( далее- вучні).

2. Змест дадзенай праграмы не мае рэгламентацыі па часе вывучэння з прычыны рэзкай дыферэнцыяцыі вучняў па рухальных, маўленчых, інтэлектуальных магчымасцях, па дынаміцы развіцця гэтых функцый. Колькасць гадзін на вывучэнне вучэбнага матэрыялу вызначаецца педагагічным работнікам на падставе вынікаў педагагічнай дыягностыкі. Педагагічны работнік мае права пераразмяркоўваць колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне раздзелаў, тэм, вучэбнага матэрыялу ўнутры тэм у межах вучэбных гадзін, рэгламентаваных вучэбным планам спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната, для вучняў з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату з улікам узроставых і псіхафізічных асаблівасцяў развіцця вучняў, індывідуальных асаблівых адукацыйных патрэб.

3. Мэта – фарміраванне практычных ведаў (санагеннага і бытавога характару) і ўменняў узаемадзеяння з навакольным светам у сацыяльна-бытавых сітуацыях, сацыяльна-адаптацыйных магчымасцей вучняў да самастойнай жыццядзейнасці.

4. Задачы:

фарміраваць уяўленні аб асабістай гігіене, самаабслугоўванні, прадметах ужытку, бытавой працы;

фарміраваць уменні ажыццяўляць самаабслугоўванне ў побыце і грамадскіх месцах;

фарміраваць жыццёва важныя рухальныя ўменні і навыкі ў побыце і сацыяльным асяроддзі;

фарміраваць камунікатыўныя функцыі (уменні ўзаемадзейнічаць з навакольнымі і кіраваць сваімі паводзінамі) у розных сацыяльна-бытавых сітуацыях.

5. Асноўная форма арганізацыі навучання сацыяльна-бытавой арыенціроўцы – карэкцыйныя заняткі. Рэкамендуемыя метады і прыёмы арганізацыі адукацыйнага працэсу:

практычныя (абследаванне прадметаў, пастаноўка практычных і пазнавальных задач, мэтанакіраваныя дзеянні з дыдактычнымі матэрыяламі, шматразовае паўтарэнне практычных і разумовых дзеянняў, наглядна-дзейсны паказ, перaймальныя практыкаванні);

наглядныя (назіранні за прадметамі і з’явамі навакольнага свету, разгляданне прадметных і сюжэтных карцін, фатаграфій і відэаматэрыялаў);

слоўныя (маўленчая інструкцыя, гутарка, апісанне прадмета, указанні, тлумачэнне, пытанні).

Да дапаможных сродкаў і спецыяльных прыбораў для палягчэння сацыяльна-бытавой дзейнасці адносяцца:

для перамяшчэння ў прасторы (крэслы-каталкі, каталкі-ложкі, каляскі, хадункі, апоры для поўзання, сістэмы для развядзення сцёгнаў і іншае);

падтрымання становішча цела (вертыкалізатары, галаватрымальнікі, падгалоўнікі, абдуктары, рамяні для фіксацыі сцёгнаў, падлакотнікі, фіксатары сегментаў цела, карсэты, спецыяльныя кліны і валікі, індывідуальныя ўстаўкі і іншае);

адчування ўласнага цела (насадкі на сегменты цела, бранзалеты-ўцяжарвальнікі, уцяжараныя камізэлькі, масажныя дыванкі, масажныя пальчаткі і іншае);

камфортнага выкарыстання прадметаў (антыслізготныя сурвэткі, насадкі на канцтавары і сталовыя прыборы, спецыяльныя сталовыя прыборы і посуд і іншае);

атрымання інфармацыі (планшэты, галасавыя памочнікі з падключэннем у Інтэрнэт, спецыяльныя клавіятуры да камп’ютараў, электронныя кнігі і іншае);

камунікацыі (малюнкі, графічныя сімвалы, піктаграмы, табліцы, камунікатыўныя кнігі, жэсты, камунікатары, планшэты, айтрэкер з доступам да камп’ютара і іншае).

6. У выніку навучання ў вучняў будуць сфарміраваны ўяўленні:

аб здаровым ладзе жыцця;

культуры зносін;

сацыяльных ролях;

нормах, каштоўнасцях, устаноўках, выпрацаваных грамадствам;

правілах і прыёмах самаабслугоўвання ў розных сацыяльна-бытавых сітуацыях;

дапаможных сродках і прыладах, якія палягчаюць сацыяльна-бытавую арыенціроўку;

уменні:

вызначаць свае абмежаванні і магчымасці ў розных сацыяльна-бытавых сітуацыях;

рэалізоўваць розныя віды сацыяльна-бытавой дзейнасці для задавальнення ўласных патрэб;

выкарыстоўваць спецыфічныя спосабы бытавой дзейнасці ва ўмовах рухальнай дэпрывацыі;

выкарыстоўваць сродкі дадатковай камунікацыі (у выпадку недастаткова сфарміраванага вуснага маўлення) або альтэрнатыўныя прылады камунікацыі (пры адсутнасці вуснага маўлення) у розных сацыяльна-бытавых сітуацыях.

## **ГЛАВА 2**
## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

### I КЛАС
### Кампетэнцыя здароўезберажэння
### Я ў прасторы

Фарміраванне ўяўленняў:

аб частках свайго цела (галава, тулава, рукі, ногі);

важнасці правільнай выпраўкі для здароўя;

адэкватным рухальным рэжыме (ранішняя зарадка, фізкультхвілінкі);

дапаможных сродках і спецыяльным абсталяванні для падтрымання і / або змянення становішча цела ў прасторы.

Фарміраванне ўменняў:

арыентавацца ў схеме цела (верхняя частка цела, ніжняя частка цела, правая частка цела, левая частка цела);

выконваць простыя (падняць левую руку, прыпадняць правую нагу і іншае) і складаныя інструкцыі (паказаць левай рукой правую нагу, узяць правай рукой які-небудзь буйны прадмет і іншае);

прымаць і ўтрымліваць фізіялагічна правільнае становішча цела ў прасторы: правільна размяшчацца ў становішчы стоячы, седзячы (за сталом, партай), лежачы (на жываце, спіне, баку) без выкарыстання (з выкарыстаннем) дапаможных сродкаў і спецыяльнага абсталявання;

выконваць адэкватны рухальны рэжым (ранішняя зарадка, фізкультхвілінкі) без выкарыстання (з выкарыстаннем) дапаможных сродкаў і спецыяльнага абсталявання.

Практычная работа: адпрацоўка змены розных становішчаў цела ў прасторы ў адпаведнасці з дэманстрацыйным матэрыялам (стоячы, седзячы, лежачы); засваенне прыёмаў выкарыстання дапаможных сродкаў і спецыяльнага абсталявання для падтрымання і/або змянення становішча цела.

Творчая работа: падабраць любімыя рухі для ранішняй зарадкі (па адным руху на кожнае становішча цела: стоячы, седзячы, лежачы).

### Сямейна-бытавая кампетэнцыя
### Я ў сям’і

Фарміраванне ўяўленняў:

аб сям'і, членах сям'і, памятных датах (дні нараджэння, сямейныя святы);

сацыяльных ролях у сям'і: сын, дачка, унук, унучка, сястра, брат;

дзеяннях, якія дэманструюць клопат пра членаў сям'і (віншаванне са святам, сумесны вольны час і іншае);

відах забаўляльнай дзейнасці з сям'ёй;

правілах прыёму ежы;

спецыяльных прыладах, якія палягчаюць захоп, утрыманне і выкананне дакладных дзеянняў пры прыёме ежы (дадатковыя насадкі на сталовыя прыборы, антыслізготныя сурвэткі і іншае).

Фарміраванне ўменняў:

выконваць сацыяльныя ролі (сын, дачка, унук, унучка, сястра, брат) у гульнявых сітуацыях (правядзенне сумеснага вольнага часу);

віншаваць членаў сям'і з днём нараджэння;

выконваць правілы прыёму ежы;

карыстацца спецыяльнымі прыладамі, якія палягчаюць захоп, утрыманне і выкананне дакладных дзеянняў пры прыёме ежы (дадатковыя насадкі на сталовыя прыборы, антыслізготныя сурвэткі і іншае).

Практычная работа: засваенне прыёмаў выкарыстання спецыяльных прылад для спажывання ежы; абыгрыванне сітуацый праяўлення клопату ў адносінах да членаў сям'і.

Творчая работа: складанне віншавання для члена сям'і.

Камунікатыўная кампетэнцыя

Я ў зносінах

Фарміраванне ўяўленняў:

аб важнасці зносін з навакольнымі;

культуры зносін (добразычлівыя адносіны да суразмоўцы, ветлівы зварот да суразмоўцы, уменне слухаць суразмоўцу, не перабіваючы яго);

спосабах выражэння розных эмоцый у голасе, міміцы і пантаміміцы;

прыёмах звароту па дапамогу да знаёмых і малазнаёмых людзей.

Фарміраванне ўменняў:

уступаць і падтрымліваць узаемадзеянне з дарослымі і аднагодкамі без дапамогі (з дапамогай) сродкаў дадатковай камунікацыі або прылад альтэрнатыўнай камунікацыі;

фармуляваць просьбу аб неабходнасці аказання дапамогі, звяртаючыся да знаёмых і малазнаёмых людзей без дапамогі (з дапамогай) сродкаў дадатковай камунікацыі або прылад альтэрнатыўнай камунікацыі;

разумець і выяўляць асноўныя эмоцыі і пачуцці;

расказваць кароткую інфармацыю пра сябе без дапамогі (з дапамогай) сродкаў дадатковай камунікацыі або прылад альтэрнатыўнай камунікацыі.

Практычная работа: засваенне прыёмаў выкарыстання сродкаў дадатковай камунікацыі або прылад альтэрнатыўнай камунікацыі для ўзаемадзеяння з дарослымі і аднагодкамі; мадэляванне паводзін у працэсе камунікацыі з улікам правіл культуры зносін.

Творчая работа: падрыхтоўка аповеду пра сябе з апорай на план.

## Сацыякультурная кампетэнцыя
## Я – вучань

Фарміраванне ўяўленняў:

пра сябе як пра вучня ў школе (знешні выгляд, патрэбы, магчымасці, абмежаванні);

сацыяльных ролях «вучань» і «член калектыву» (правы і абавязкі);

калектывізме (адзіны клас вучняў), узаемадапамозе (у адрас аднакласнікаў), гатоўнасці працаваць (вучыцца);

патрабаваннях да знешняга выгляду вучняў і школьнай формы;

правілах паводзін у класе, сталовай, спартыўнай зале.

Фарміраванне ўменняў:

уступаць і падтрымліваць узаемадзеянне з іншымі вучнямі ў розных сітуацыях;

выконваць правілы паводзін у класе, сталовай, спартыўнай зале;

прытрымлівацца патрабаванняў да школьнай формы вучня.

Практычная работа: засваенне прыёмаў уступлення і падтрымання ўзаемадзеяння з аднагодкамі; засваенне прыёмаў аказання дапамогі аднакласнікам; мадэляванне правільных паводзін у класе, сталовай, спартыўнай зале.

Творчая работа: падбор камплекта адзення дзелавога стылю для знаходжання ў школе.

## ЧАКАНЫЯ ВЫНІКІ

Вучні маюць уяўленні:

аб схеме цела;

адэкватным рухальным рэжыме;

сям'і, членах сям'і;

даступных для дзяцей сацыяльных ролях у сям'і і школе;

культуры зносін;

правілах паводзін у школе;

умеюць:

арыентавацца ў схеме цела;

прымаць і змяняць становішча ў прасторы без выкарыстання (з выкарыстаннем) дапаможных сродкаў і спецыяльнага абсталявання;

віншаваць членаў сям’і з днём нараджэння, зыходзячы з даступнай сацыяльнай ролі;

выконваць правілы культуры зносін (уступаць і падтрымліваць узаемадзеянне з аднагодкамі) без дапамогі (з дапамогай) сродкаў дадатковай камунікацыі або прылад альтэрнатыўнай камунікацыі;

складаць кароткія апавяданні пра сябе па плане;

выконваць правы і абавязкі, звязаныя з сацыяльнай роляй вучня.

## II КЛАС

### Кампетэнцыя здароўезберажэння

### Мая асабістая гігіена

Фарміраванне ўяўленняў:

аб скуры і яе функцыях (абарона ад механічных пашкоджанняў, вылучэнне поту, падтрыманне пастаяннай тэмпературы цела, скураная адчувальнасць);

першай дапамозе пры механічных пашкоджаннях скуры;

правілах асабістай гігіены цела;

туалетных прыладах і сродках асабістай гігіены (мыла, шампунь, кандыцыянер для валасоў, шчоткі для мыцця рук, ног, мачалкі і іншае);

правілах догляду і захоўвання туалетных прылад і сродкаў асабістай гігіены;

рэжыме дня (суаднясенне часу сутак з пазавучэбнай і вучэбнай дзейнасцю).

Фарміраванне ўменняў:

самастойна або з дапамогай прамываць вадой раны (драпіны, парэзы);

самастойна або з дапамогай выкарыстоўваць па прызначэнні перакіс вадароду, вату, бінт, пластыр і іншыя сродкі апрацоўкі ран (драпін, парэзаў);

самастойна або з дапамогай выконваць гігіенічныя працэдуры, ахайна карыстацца прыбіральняй без выкарыстання (з выкарыстаннем) дапаможных сродкаў і спецыяльных прылад;

выконваць алгарытмы дзеянняў пры мыцці, выціранні твару, ног, доглядзе валасоў і іншых працэдур па доглядзе цела;

падбіраць туалетныя прылады, сродкі асабістай гігіены і выкарыстоўваць іх па прызначэнні;

выконваць рэжым дня дома і ў школе.

Практычная работа: засваенне прыёмаў аказання першай дапамогі пры механічных пашкоджаннях скуры; адпрацоўка алгарытмаў выкарыстання туалетных прылад, сродкаў асабістай гігіены.

Творчая работа: складанне свайго рэжыму дня з апорай на план.

Сямейна-бытавая кампетэнцыя

Маё самаабслугоўванне

Фарміраванне ўяўленняў:

аб відах адзення/абутку (хатняе, штодзённае, рабочае, спартыўнае, святочнае і іншае);

спосабах догляду адзення / абутку;

культуры і гігіене харчавання, здаровай ежы.

Фарміраванне ўменняў:

апранаць адзенне і абутак без выкарыстання (з выкарыстаннем) дапаможных сродкаў і спецыяльнага абсталявання;

падбіраць і насіць адзенне/абутак у адпаведнасці з прызначэннем, па сезоне;

ажыццяўляць паўсядзённы догляд адзення/абутку (складваць, сарціраваць, чысціць, захоўваць);

ажыццяўляць першасную апрацоўку прадуктаў харчавання (сарціроўку, мыццё, чыстку).

Практычная работа: засваенне ўменняў ажыццяўляць першасную апрацоўку прадуктаў харчавання; адпрацоўка алгарытмаў апранання і абування без выкарыстання (з выкарыстаннем) дапаможных сродкаў і спецыяльнага абсталявання.

Творчая работа: падбор адзення з улікам сацыяльнай сітуацыі (для свят, прагулак, заняткаў спортам і іншае).

Камунікатыўная кампетэнцыя

Мае зносіны ў побыце

Фарміраванне ўяўленняў:

аб культуры зносін у побыце (правілах зносін са знаёмымі і малазнаёмымі людзьмі ў розных сацыяльна-бытавых сітуацыях);

сацыяльна значнай інфармацыі пры знаёмстве з аднагодкамі (імя, узрост, інтарэсы, захапленні і іншае);

сродках сувязі (тэлефон, смартфон, планшэт і іншае) і спосабах камунікацыі з дапамогай сродкаў сувязі.

Фарміраванне ўменняў:

уступаць у камунікацыю і падтрымліваць зносіны без дапамогі (з дапамогай) сродкаў дадатковай камунікацыі або прылад альтэрнатыўнай камунікацыі;

узнаўляць сацыяльна значную інфармацыю аб сабе (імя, прозвішча, узрост) і сваёй сям’і без дапамогі (з дапамогай) сродкаў дадатковай камунікацыі або прылад альтэрнатыўнай камунікацыі;

адрозніваць у працэсе зносін дыялагічнае і маналагічнае маўленне.

Практычная работа: мадэляванне сітуацый выкарыстання дыялагічнага і маналагічнага маўлення; адпрацоўка алгарытмаў знаёмства

з аднагодкамі ў розных сітуацыях узаемадзеяння (у школе, на дзіцячай пляцоўцы і ў іншых грамадскіх месцах).

Творчая работа: складанне сацыяльна значнай інфармацыі пра сябе для знаёмства з аднагодкамі (імя, узрост, інтарэсы, захапленні і іншае).

Сацыякультурная кампетэнцыя

Я ў школе

Фарміраванне ўяўленняў:

аб правілах паводзін у школе і на яе тэрыторыі;

значэнні сяброўства, ролі сябра, таварыша;

прыёмах узаемадзеяння з аднакласнікамі, педагогамі, іншымі педагагічнымі работнікамі ў адпаведнасці з сацыяльнай роляй «вучань», «член калектыву».

Фарміраванне ўменняў:

выконваць правілы паводзін у школе і на яе тэрыторыі;

устанаўліваць і падтрымліваць узаемадзеянне з аднакласнікамі, педагогамі, іншымі педагагічнымі работнікамі ў адпаведнасці з сацыяльнай роляй «вучань», «член калектыву»;

ацэньваць учынкі сябра (таварыша) у розных сацыяльных сітуацыях.

Практычная работа: засваенне прыёмаў узаемадзеяння з аднакласнікамі, педагогамі, іншымі педагагічнымі работнікамі ў адпаведнасці з сацыяльнай роляй «вучань», «член калектыву»; засваенне прыёмаў устанаўлення і падтрымання сяброўскіх адносін з аднакласнікамі.

Творчая работа: падрыхтоўка аповеду на тэмы «Які я сябар? / Які ў мяне сябар?» з апорай на план.

ЧАКАНЫЯ ВЫНІКІ

Вучні маюць уяўленні:

аб правілах асабістай гігіены;

рэжыме дня;

спосабах догляду за асабістымі рэчамі;

культуры здаровага харчавання;

правілах зносін са знаёмымі, малазнаёмымі;

сутнасці паняццяў «сяброўства», «сябар», «таварыш»;

умеюць:

падбіраць туалетныя прылады і асабістыя сродкі гігіены;

аказваць першую дапамогу/прасіць аб першай дапамозе пры атрыманні драпін/ран;

ажыццяўляць першасную апрацоўку прадуктаў харчавання;

апранаць і насіць адзенне / абутак акуратна і ў адпаведнасці з прызначэннем;

устанаўліваць і падтрымліваць камунікацыю са знаёмымі і малазнаёмымі людзьмі, разумець і будаваць выказванні без дапамогі (з дапамогай) сродкаў дадатковай камунікацыі ці прылад альтэрнатыўнай камунікацыі;

падтрымліваць сяброўскія адносіны з аднагодкамі.

III КЛАС

Кампетэнцыя здароўезберажэння

Мой знешні выгляд

Фарміраванне ўяўленняў:

аб органах пачуццяў, іх функцыях;

правілах гігіены органаў пачуццяў (гігіена поласці рота, вушэй, вачэй, носа);

туалетных прыладах і сродках асабістай гігіены (зубная паста, розныя мадэлі зубных шчотак, ватныя палачкі, насоўкі і іншае);

ахайным знешнім выглядзе і спосабах яго падтрымання (акуратная прычоска, догляд пазногцяў, адзенне па надвор'і і іншае);

здаровым харчаванні, харчовых атручваннях і іх прычынах.

Фарміраванне ўменняў:

самастойна або з дапамогай карыстацца туалетнымі прыладамі і сродкамі асабістай гігіены;

самастойна ці з дапамогай падтрымліваць ахайны знешні выгляд;

вызначаць ступень дабраякаснасці харчовых прадуктаў на аснове органаў пачуццяў (агледзець прадукт, панюхаць і абмацаць яго);

правяраць тэрмін прыдатнасці харчовых прадуктаў.

Практычная работа: засваенне прыёмаў падтрымання ахайнага знешняга выгляду пры наведванні грамадскіх месцаў (знешні выгляд у школе, у гасцях, на вуліцы, у парку і іншых грамадскіх месцах); падбіраць туалетныя прылады і сродкі асабістай гігіены ў залежнасці ад сітуацыі (догляд вушэй, чыстка зубоў і іншае); вызначаць ступень дабраякаснасці і тэрміны прыдатнасці харчовых прадуктаў.

Творчая работа: мадэляванне прыёмаў змянення знешнасці (прычоска, адзенне і іншае).

Сямейна-бытавая кампетэнцыя

Мая дапамога дарослым

Фарміраванне ўяўленняў:

аб памяшканнях і абсталяванні кватэры (дома), іх прызначэнні, прадметах побыту і іх функцыянальным прызначэнні;

відах падтрымання парадку ў сваім пакоі (прыбіраць на рабочым стале, выкідваць смецце, запраўляць ложак і іншае);

сродках падтрымання чысціні і парадку ў пакоі і іх бяспечным выкарыстанні (ануча для праціранне пылу, венік, шуфлік і іншае);

элементарных правілах догляду пакаёвых раслін (паліў, выдаленне сухога лісця);

відах посуду і сталовых прыбораў, правілах захоўвання і догляду за імі;

дапаможных сродках і спецыяльным абсталяванні, прыладах для аблягчэння падтрымання парадку ў кватэры.

Фарміраванне ўменняў:

арыентавацца ў бытавых сітуацыях і аказваць пасільную дапамогу бацькам у хатніх справах;

падтрымліваць парадак на рабочым стале, чысціць паверхню стала ад забруджванняў, акуратна збіраць смецце і выкідваць яго;

падтрымліваць парадак у кватэры без выкарыстання дапаможных сродкаў і спецыяльнага абсталявання ў розных сацыяльна-бытавых сітуацыях;

карыстацца сталовымі прыборамі ў адпаведнасці з іх прызначэннем, антыслізготнай сурвэткай;

мыць посуд, выкарыстоўваючы сродкі для яго мыцця (губка, сродак для мыцця посуду, ручнік і іншае).

Практычная работа: засваенне прыёмаў догляду пакаёвых раслін (паліў раслін і выдаленне сухога лісця); засваенне прыёмаў падтрымання парадку ў сваім пакоі; адпрацоўка алгарытмаў выкарыстання дапаможных сродкаў, спецыяльнага абсталявання і прылад у розных бытавых сітуацыях у межах тэмы.

Творчая работа: складанне аповеду аб сваіх абавязках дома і дапамозе дарослым дома.

### Камунікатыўная кампетэнцыя

### Мае зносіны ў грамадскіх месцах

Фарміраванне ўяўленняў:

аб правілах камунікацыі з незнаёмымі і малазнаёмымі людзьмі ў грамадскіх месцах;

правілах карыстання мабільнымі сродкамі сувязі ў грамадскіх месцах (музей, кінатэатр, магазін);

прыёмах узаемадзеяння з акружаючымі людзьмі ў грамадскіх месцах і людзьмі, якія знаходзяцца дыстанцыйна на сувязі.

Фарміраванне ўменняў:

узнаўляць сацыяльна значную інфармацыю аб людзях блізкага асяроддзя без дапамогі (з дапамогай) сродкаў дадатковай камунікацыі або прылад альтэрнатыўнай камунікацыі;

весці дыялог, які дазваляе атрымаць патрэбную інфармацыю ў незнаёмых і малазнаёмых людзей;

выкарыстоўваць ветлівыя словы і выразы (прывітанне, зварот, знаёмства, запрашэнне, просьба, згода і адмова, падзяка, развітанне) у працэсе зносін з незнаёмымі і малазнаёмымі людзьмі;

фармуляваць просьбу аб неабходнасці аказання дапамогі, звяртаючыся да незнаёмых людзей без дапамогі (з дапамогай) сродкаў дадатковай камунікацыі або прылад альтэрнатыўнай камунікацыі.

Практычная работа: засваенне прыёмаў звароту па дапамогу, прыняцце дапамогі акружаючых і адмова ад яе, выказванне пачуццяў падзякі, удзячнасці за аказаную дапамогу; адпрацоўка алгарытмаў вядзення дыялогу з незнаёмымі і малазнаёмымі людзьмі.

Творчая работа: абыгрыванне сітуацый камунікацыі з незнаёмымі і малазнаёмымі людзьмі ў працэсе тэатральна-мастацкай дзейнасці.

Сацыякультурная кампетэнцыя

Я ў грамадскіх месцах

Фарміраванне ўяўленняў:

аб нормах, каштоўнасцях, установках паводзін у грамадскіх месцах, выпрацаваных грамадствам;

школьнай бібліятэцы і правілах паводзін у ёй;

сістэме прымальных паводзін у розных жыццёвых сітуацыях (на вуліцы, у школе і іншых грамадскіх месцах);

сацыяльных ролях (пасажыр, пакупнік, пацыент, глядач і іншае);

правілах бяспечных паводзін у транспарце і пешахода на дарозе.

Фарміраванне ўменняў:

ацэньваць паводзіны іншых людзей у грамадскіх месцах у адпаведнасці з нормамі, каштоўнасцямі, установкамі, выпрацаванымі грамадствам;

выконваць правілы паводзін у бібліятэцы;

вызначаць бяспечныя і небяспечныя паводзіны ў адрас вучня ў грамадскіх месцах па зададзеным сюжэце (па карцінках, слайдах, відэа);

выконваць прымальныя паводзіны, якія адпавядаюць сацыяльным ролям (пасажыр, пакупнік, пацыент, глядач і іншае) па зададзеным сюжэце;

выконваць правілы дарожнага руху на пешаходным пераходзе і правілы бяспечных паводзін у грамадскім транспарце.

Практычная работа: мадэляванне сацыяльных роляў (пасажыр, пакупнік, пацыент, глядач і іншае); мадэляванне сітуацый паводзін у грамадскім транспарце і на пешаходным пераходзе.

Творчая работа: абыгрыванне сацыяльных роляў (пасажыр, пакупнік, пацыент, глядач і іншае) у працэсе тэатральна-мастацкай дзейнасці.

## ЧАКАНЫЯ ВЫНІКІ

Вучні маюць уяўленні:

аб органах пачуццяў і іх гігіене;

правілах бяспечнага прыёму ежы;

прадметах побыту і іх прызначэнні;

прыёмах падтрымання парадку ў кватэры;

прыёмах узаемадзеяння з акружаючымі людзьмі і з людзьмі, якія знаходзяцца дыстанцыйна на сувязі;

правілах карыстання мабільнымі сродкамі сувязі ў грамадскіх месцах;

правілах паводзін у грамадскіх месцах;

умеюць:

падтрымліваць ахайны знешні выгляд;

самастойна мыць посуд, выкарыстоўваць сродкі для мыцця, прыбіраць паверхню стала, сервіраваць яго, падаваць і прыбіраць стравы;

культурна паводзіць сябе за сталом, падтрымліваць правільную позу падчас ежы, карыстацца сталовымі прыборамі ў адпаведнасці з іх прызначэннем, карыстацца антыслізготнай сурвэткай;

узнаўляць сацыяльна значную інфармацыю аб людзях блізкага асяроддзя без дапамогі (з дапамогай) сродкаў дадатковай камунікацыі або прылад альтэрнатыўнай камунікацыі;

весці мэтанакіраваны дыялог і прасіць аб дапамозе ў выпадку неабходнасці;

выконваць правілы паводзін у грамадскіх месцах.

## IV КЛАС
### Кампетэнцыя здароўезберажэння
### Мая ахова здароўя

Фарміраванне ўяўленняў:

аб траўмах частак цела і скуры (удар, вывіх, перапом, абмаражэнне, апёк і іншыя);

захворваннях органаў пачуццяў (боль у горле, кашаль, насмарк, закладзенасць носа, пачырваненне вачэй, моцнае слёзавыдзяленне, востры боль у вачах і іншае);

правілах аховы зроку пры чытанні, праглядзе тэлеперадач, рабоце з камп’ютарам;

правілах асабістай гігіены ў грамадскіх месцах (мыццё рук, апрацоўка рук антысептычным гелем; чхаць і смаркацца ў насоўку, сурвэткі і іншае);

шкодным уплыве тытунекурэння, алкаголю, наркатычных рэчываў на арганізм;

правілах бяспечнай жыццядзейнасці (на вуліцы, у школе, парку і іншых месцах);

спецыяльным транспарце і нумарах выкліку спецыяльных служб (служба выратавання, міліцыя, хуткая медыцынская дапамога, аварыйная служба газавай сеткі).

Фарміраванне ўменняў:

вызначаць наяўнасць траўмы па знешніх і ўнутраных прыметах (боль у нерухомым становішчы і пры руху, прыпухласць і ацёчнасць скуры ў зоне траўмы, крывацёк і іншае);

вызначаць наяўнасць захворвання органаў пачуццяў па знешніх і ўнутраных прыметах (боль, сверб, вылучэнне вадкасці з вачэй, носа, змена колеру скуры вакол органа пачуццяў і іншае);

самастойна выконваць правілы аховы зроку пры чытанні ў школе і дома, пры праглядзе тэлеперадач і рабоце за камп’ютарам;

самастойна карыстацца антысептычным гелем, сурвэткамі, насоўкай і іншымі сродкамі асабістай гігіены ў грамадскіх месцах;

пазбягаць небяспечных сітуацый, звязаных са спробамі ўцягвання ў тытунекурэнне, распіванне алкаголю і ўжыванне наркатычных рэчываў;

выконваць правілы бяспекі жыццядзейнасці;

распазнаваць небяспечныя сітуацыі, якія патрабуюць выкліку спецыяльных служб.

Практычная работа: засваенне прыёмаў выкарыстання антысептычнага гелю, сурвэтак, насоўкі і іншых сродкаў асабістай гігіены ў грамадскіх месцах; адпрацоўка алгарытмаў звароту ў спецыяльныя службы (служба выратавання, міліцыя, хуткая медыцынская дапамога, аварыйная служба газавай сеткі).

Творчая работа: падрыхтоўка паведамлення і плаката (прэзентацыі) на тэму карысці актыўнага ладу жыцця для здароўя.

Сямейна-бытавая кампетэнцыя

Я і парадак у кватэры

Фарміраванне ўяўленняў:

аб правілах і відах уборкі памяшканняў (сухая і вільготная прыборка);

спосабах мыцця адзення (рукамі і з дапамогай пральнай машыны);

правілах і спосабах прасавання адзення з розных відаў тканіны (баваўняных, шарсцяных і сінтэтычных);

бытавой тэхніцы, правілах яе выкарыстання і тэхніцы бяспекі;

элементарных правілах догляду хатніх гадаванцаў (кот, сабака, хамяк, папугай, рыбкі і іншыя);

магчымых небяспечных сітуацыях у побыце (задымленне, узгаранне і пажар, пах газу і іншае парушэнне работы бытавой тэхнікі).

Фарміраванне ўменняў:

визначаць санітарны стан памяшкання (вымяраць тэмпературу паветра ў памяшканні, правяраць наяўнасць пылу і бруду, смецця ў пакоях рознага прызначэння);

карыстацца электрачайнікам, мікрахвалевай печчу, пыласосам, прасам, пральнай машынай (уключаць, выкарыстоўваць па прызначэнні, выключаць);

выконваць паслядоўнасць дзеянняў пры правядзенні розных відаў прыбірання (сухога і вільготнага);

выконваць паслядоўнасць аперацый пры мыцці (сарціроўка бялізны, замочванне, мыццё, паласканне, адцісканне, развешванне);

выкарыстоўваць бытавую тэхніку пры прыбіранні памяшканняў, у працэсе мыцця, прасавання адзення і іншага без выкарыстання (з выкарыстаннем) дапаможных сродкаў і спецыяльнага абсталявання.

Практычная работа: засваенне прыёмаў выкарыстання бытавой тэхнікі ў адпаведнасці з правіламі тэхнікі бяспекі; адпрацоўка алгарытмаў розных працоўных аперацый па зададзеным сюжэце (выкананне аперацый у працэсах прыбірання, мыцця, гатавання, клопаты аб хатніх гадаванцах і іншае); адпрацоўка алгарытмаў дзеяння ў небяспечных бытавых сітуацыях.

Творчая работа: падрыхтоўка паведамлення і плаката (прэзентацыі) аб карысці для здароўя прыбірання і чысціні ў доме.

Камунікатыўная кампетэнцыя

Мая самапрэзентацыя

Фарміраванне ўяўленняў:

аб важнасці самапрэзентацыі сябе як асобы ў грамадстве;

прыёмах самапрэзентацыі ў адпаведнасці з месцам і асяроддзем у працэсе зносін;

правілах паводзін у працэсе прэзентацыі сябе і іншых.

Фарміраванне ўменняў:

вызначаць прыдатныя сітуацыі для самапрэзентацыі (на вуліцы, у школе і іншых грамадскіх месцах);

адбіраць прыдатную інфармацыю для самапрэзентацыі;

выконваць правілы паводзін у працэсе прэзентацыі сябе і іншых.

Практычная работа: засваенне прыёмаў самапрэзентацыі; адпрацоўка алгарытму складання самапрэзентацыі ў розных сітуацыях.

Творчая работа: скласці самапрэзентацыю для знаёмства з аднагодкамі і малазнаёмымі людзьмі.

Сацыякультурная кампетэнцыя

Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь

Фарміраванне ўяўленняў:

аб сацыяльнай ролі грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

асаблівасцях нацыянальнай культуры, традыцыйных беларускіх абрадах і святах;

вядомых людзях, якія славілі/славяць Рэспубліку Беларусь сваёй прафесійнай дзейнасцю;

гісторыях людзей, чыімі імёнамі названы вуліцы гарадоў.

Фарміраванне ўменняў:

самастойна або з дапамогай выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі (кнігі, часопісы, інтэрнэт-рэсурсы і іншае) для пашырэння ўяўленняў аб Рэспубліцы Беларусь, яе гісторыі і нацыянальных традыцыях;

шанаваць і ганарыцца сваёй Радзімай праз знаёмства з творамі мастацтва, кінематографа, спартыўнымі і навуковымі дасягненнямі.

Практычная работа: засваенне прыёмаў мэтанакіраванага выкарыстання розных крыніц інфармацыі (кнігі, часопісы, інтэрнэт-рэсурсы і іншае); адпрацоўка правіл паводзін падчас выкарыстання дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь (пры выкананні Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, узняцці Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь і іншае).

Творчая работа: падрыхтоўка паведамлення/прэзентацыі пра беларускі абрад/свята Рэспублікі Беларусь з апорай на план.

## ЧАКАНЫЯ ВЫНІКІ

Вучні маюць уяўленні:

аб правілах аховы зроку, дыхання, слыху;

прастудных захворваннях і траўматызме ў розныя поры года;

правілах бяспечнай жыццядзейнасці;

прыбіранні памяшканняў у кватэры;

магчымых небяспечных сітуацыях у побыце;

прыёмах самапрэзентацыі;

асаблівасцях нацыянальнай культуры, беларускіх абрадах і святах;

умеюць:

вызначаць наяўнасць траўмы і захворвання па знешніх і ўнутраных прыметах;

самастойна выконваць правілы асабістай гігіены ў грамадскіх месцах;

вызначаць санітарны стан памяшканняў у кватэры;

карыстацца бытавымі і электрычнымі прыборамі на кухні;

выконваць правілы паводзін у працэсе прэзентацыі сябе і іншых;

паведамляць суразмоўцу (суразмоўцам) інфармацыю, атрыманую з розных крыніц без дапамогі (з дапамогай) сродкаў дадатковай камунікацыі або прылад альтэрнатыўнай камунікацыі;

выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі для пошуку дакладных матэрыялаў аб Рэспубліцы Беларусь і яе гісторыі.